**УДК 39(476-22)(091)**

# ЗБІРАЛЬНІЦТВА Ў СІСТЭМЕ ЖЫЦЦЕЗАБЕСПЯЧЭННЯ ПАСЛЯВАЕННАЙ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ[1]

***канд. гіст. навук, дац. А.В. СУМКО***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Аналізуецца роля і месца збіральніцтва ў сістэме жыццезабеспячэння паваеннай беларускай вёскі ва ўмовах аднаўленчых працэсаў. У якасьці крыніц выступілі матэрыялы вуснай гісторыі. У навуковы зварот упершыню ўведзены этнаграфічныя крыніцы, зафіксаваныя падчас палявых даследаванняў 2000-х гг. на тэрыторыі Беларускага Падзвіння.*

***Ключавыя словы:*** *пасляваеннае аднаўленне, вёска, сістэма жыццезабеспячэння, промыслы, збіральніцтва, Беларускае Падзвінне.*

**Уводзіны.** Збіральніцтва з'яўляецца дапаможным заняткам да земляробства як асноўнай крыніцы здабывання сродкаў існавання ў сельскай мясцовасці. Аднак яго нельга разглядаць як маргінальны промысел, які дазваляў атрымліваць нязначны аб'ём дадатковага харчавання, бо "дары прыроды" забяспечвалі людзей неабходнай для жыцця сыравінай, кармамі для скаціны, лекавымі сродкамі [1, с. 38]. Дармовыя прыродныя рэсурсы рабілі ежу больш разнастайнай і ўзбагачалі рацыён вяскоўца вітамінамі і мікраэлементамі. Каласальную ролю не проста ў сістэме жыццезабеспячэння, але ў сферы фізічнага выжывання людзей, збіральніцтва пачынала адыгрываць у "галодныя гады" – падчас ваенных канфліктаў ці стыхійных бедстваў (засухі, няўрадлівых гадоў), бо менавіта яно давала неабходны мінімум, які дазваляў чалавеку не памерці з голаду. Вельмі яскрава гэта праявілася ў першыя гады пасля вызвалення Беларусі ад нацыстаў, калі ў спустошаных раёнах сельская гаспадарка знаходзілася ў стане поўнага заняпаду і разбурэння. Людзі былі вымушаныя змагацца за выжыванне, максімальна выкарыстоўваючы ўсе наяўныя рэсурсы. Разам з тым, роля і месца збіральніцтва ў сістэме жыццезабеспячэння беларускай вёскі ў перыяд пасляваеннага аднаўлення недастаткова асвятлялася ў айчыннай гістарыяграфіі. Праблема выкарыстання прыродных рэсурсаў у паўсядзенным жыцці разглядалася пераважна ў кантэксце асвятлення традыцыйнай матэрыяльнай беларускай культуры [2], традыцый харчавання [3; 4], традыцыйных уяўленняў беларусаў аб раслінным свеце [5; 6] і інш. Збіральніцтву, як аднаму са спрадвечных спосабаў здабывання расліннай і жывёльнай ежы, прысвечаны раздзел у шматтомным гісторыка-этнаграфічным даследаванні пад агульнай назвай "Беларусы" [1], дзе ў гістарычнай рэтраспекцыі, пераважна на падставе матэрыялаў XIX і XX ст., разглядаецца дынаміка развіцця промыслаў, прыводзіцца спектр раслін і сыравіны, перыяды іх збору, а таксама падкрэсліваецца роля этнічнага вопыту, які перыядычна актуалізуецца ў неспрыяльныя эканамічныя перыяды. Рэчаіснасць пасля вызвалення ад нацыстаў амаль не закраналася ў даследаваннях, аўтары з большага адзначалі, што ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ў сувязі з недахопам прадуктаў харчавання і прамысловай прадукцыі назіралася ажыўленне промыслаў і рамесстваў, а ў сістэме харчавання менш ужывалі базавыя прадукты і часцей выкарыстоўвалі прыдатныя да яды часткі раслін.

У якасці геаграфіі даследавання выступае сучасная Віцебская вобласць, на тэрыторыі якой у пасляваенныя гады суіснавалі два субрэгіёны з рознымі зыходнымі сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі (ва ўсходніх раёнах – аднаўленне сельскай гаспадаркі і калгаснай сістэмы, у заходніх раёнах – паступовая ліквідацыя аднаасобных гаспадарак і пераход да прымусовай калектывізацыі, якая суправаджалася разбурэннем традыцыйнага сялянскага ладу жыцця) і неаднолькавай ступенню разбурэння. Такім чынам, Віцебшчына – унікальны рэгіён, які прадстаўляе дзве мадэлі сістэмы жыццезабеспячэння ў пасляваенны перыяд, якія могуць быць транспарэнтнымі для ўсёй Беларусі, як для Усходняй, так і для Заходняй. Вывучэнне праблемы выкарыстання прыродных рэсурсаў у пасляваенныя гады на прыкладзе пэўнага рэгіёну дае магчымасць дэталёва прааналізаваць з'яву, вызначыць ролю і месца збіральніцтва ў сістэме жыццезабеспячэння пасляваеннай вёскі. Паводле гісторыка-этнаграфічнага раёнавання, геаграфія даследавання адпавядае рэгіёну Беларускага Падзвіння.

У якасці крыніц выступілі матэрыялы вуснай гісторыі, зафіксаваныя падчас палявых экспедыцый Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 2000-х гг. на тэрыторыі Беларускага Падзвіння. Пераважная большасць рэспандэнтаў былі непаўналетнімі ў разглядаемы перыяд, але дзеці і падлеткі адыгрывалі вельмі значную ролю ў пасляваеннай сістэме жыццезабеспячэння, валодалі пэўнай сістэмай ведаў, якую засвойвалі ад дарослых.

[1] Артыкул падрыхтаваны ў рамках праекта БРФФД–РФФД "Субкультура детства в дискурсе устной истории, языке и фольклоре Витебско-Псковского пограничья XX – начала XXI века", дамова № Г20Р-095/.

**Асноўная частка.** Разглядаемы рэгіён вельмі пацярпеў падчас вайны і нацысцкай акупацыі. З 36 найбольш пацярпелых раёнаў рэспублікі, 13 (больш 36% ад усіх) раёнаў адносіліся да сучаснай Віцебскай вобласці. Некаторыя населеныя пункты былі цалкам спустошаныя. Паказальнай можа быць сітуацыя ў вызваленым Расонскім раёне, дзе ў 10 з 16 сельскіх саветаў былі цалкам знішчаны грамадзскія і жылыя забудовы, сельскагаспадарчы інвентар і дамашнія жывёлы, а з 38 000 даваенага насельніцтва засталося 17 508 чалавек, якія ва ўмовах ваеных дзеянняў 1944 г. пасяўныя работы не праводзілі [7, л. 13]. Частка насельніцтва Расонскага раёна амаль год хавалася ў лясах, а частка была эвакуіравана ў раёны Калінінградскай вобласці. Пасля вяртання на вызваленую тэрыторыю людзі апынуліся ў надзвычай экстрэмальных умовах: "*Уся дзярэўня згарэўшы. Весь Расонскі раён счытай згарэўшы. На пянёк сталі, пастаялі, пакруціліся, нічога не было… бур'ян.*"[2]. На спустошанай тэрыторыі вельмі востра стаяла праблема з прадуктамі харчавання. У надзвычай складаным становішчы апынуліся тыя, хто вяртаўся з нямецкага палону або эвакуацыі, бо яны не мелі ўласных харчовых запасаў, а разлічваць на ўраджай са свайго прысядзібнага ўчастка не даводзілася. Адноўленыя ў першы год пасля вызвалення калгасы знаходзіліся ў цяжкім стане, асабліва ў раёнах, найбольш пацярпелых ад нацыстаў, таму магчымасці эканамічнай дапамогі былі вельмі абмежаваныя. Напрыклад, у дакладной запісцы сакратару Полацкага абкама КП(б)Б ад 25 студзеня 1946 г. паведамлялася, што ў Асвейскім раёне пасля таго, як калгасы разлічыліся па ўсіх відах хлебапаставак з дзяржавай толькі ў пяці калгасах былі засыпаны насенныя фонды і выдадзена авансам калгаснікам ад 200 да 500 грам на працадзень (200 чалавек), у астатніх 69 калгасах (7 898 чалавек) насенныя фонды засталіся не запоўненымі і на працадні нічога не было размеркавана [8, л. 1]. Акрамя таго, сітуацыю з харчаваннем ускладнялі пасляваенныя неўраджаі, якія былі вынікам неспрыяльных умоў надвор'я ў 1945 і 1946 гадах. Напрыклад, у тым жа Асвейскім раёне ў 1945 г. на працягу двух тыдняў ішлі штодня праліўныя дажджы, якія прывялі да разлівання вадаёмаў і знішчылі фактычна ўвесь ураджай [8, л. 12]. Голад і звязанае з ім знясіленне станавіліся прычынай росту хваробаў і смертнасці ў рэгіёне: "*Ад голада людзі пухлі. Мы былі павысыхаўшы, толькі не ўміралі. У Ніны ручкі як нітачкі, а жывот можа, што вадой паілі, жывот быў большы*" (Верхнядзвінскі р-н)[3].У ежу ішло ўсё, што мог пераварыць чалавечы страўнік: "*Да, а як жа ш! Усё елі, тады, як ужо вясна ды лета, тады лягчэй, ужэ на поле сабіралі шчаўлюк, там усякую траву*" (Полацкі р-н)[4]. У такіх умовах збіральніцтва набывае вельмі значную ролю і становіцца адной з асноўных крыніц жыццезабеспячэння. Акрамя задавальвання базавых патрэб, дзікарослыя расліны выкарыстоўваліся ў розных сферах, у тым ліку для лячэння і нармалізацыі асноўных фізіялагічных функцый чалавека [6, с. 42].

Збіральніцтва дазваляла пераажыць складаны вясновы перыяд і пратрымацца да новага ўраджаю. Пра гэта вельмі красамоўна ўзгадвалі рэспандэнты: "*Ну даждаліся лета. І гэта ўжо аджылі, паявіўся шчавель, паявіліся грыбы.. Тут ужо і агарод пасеялі, восенню мы ўжо нармальна былі*" (Полацкі р-н)[5]; "*Як выжылі? – Лебяду, крапіву елі. У ягады хадзілі.*" (Міёрскі р-н)[6].

Неабходна адзначыць, што збіральніцтва пасляваеннага часу арганічна звязана з усёй сістэмай этнабатанічных ведаў, уласцівых беларускай традыцыйнай культуры, іншымі словамі пошук ядомых раслін адбываўся не хаатычна, а з улікам шматвекавога досведу ў галіне этнабатанікі. Гэта падцвярджаецца тым, што экстрымальныя перыяды ў гісторыі беларускага этнаса ці яго асобных частак у папярэднія эпохі адбываліся перыядычна і былі звязаны не толькі са шматлікімі войнамі, але і частымі неўродамі. У пэўныя гады XIX ст. мука была толькі связуючым кампанентам, а аснову хлеба складала трава (лебяда, шчавель, жалуды і інш) [3, с. 174]. Як адзначаў В.С. Цітоў, суровы гістарычны вопыт навучыў беларусаў звяртацца ў цяжкі часы да тых відаў флоры, якія ў сістэме народных ведаў лічыліся патэнцыяльна карыснымі, і ў экстрэмальных умовах уключаць іх у рацыён харчавання. У гады недароду і ліхалецціяў у хлеб, апрача мякіны, лупіну і лебяды, дабаўлялі лісце ліпы, маладой папараці, балотнага бабоўніку, верасу, капытніку, вадзяных гарлачыкаў, кветкі канюшыны, дзятліны, бярозавую кару і інш. [2, с. 181]. Выкарыстанне этнічнага вопыту ў сферы экстрымальнай гастранаміі было характэрна для ўсёй Беларусі і сустракаецца ў розныя гістарычныя перыяды: "Ён (паляшук) умее павялічыць запасы хлеба, дадаючы да мукі лебяду – пустазелле, вядомае яму з даўніх часоў; радзей дадае вотруб'е, а калі выпадае галодны год, дык і белую гліну дамешвае, тую самую, што аздабляе і аднаўляе хату, а ў неўрадлівыя гады напаўняе ёю страўнік, суцішваючы пакуты ад голаду. Зрэшты яго падтрымлівае бульбачка, лясныя ягады, арэхі, грыбы… Палескія жанчыны ведаюць свой край і бяруць ад яго ўсё, што можна з'есці" [9, s. 63].

У крытычныя перыяды менавіта дзікарослыя расліны з'яўляліся тым неабходных для жыццядзейнасці арганізма харчовым рэсурсам, які, ва ўмовах катастрафічнага недахопу базавых прадуктаў, дазваляў

[2]Фальклорны архіў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (ФА ПДУ) : Зап. у 2019 г. ад Кандрацьевай Надзеі Антонаўны, 1928 г.н., в. Янкавічы Расонскага р-на.

[3] ФА ПДУ: Зап. у 2020 г. ад Аненскай Яўгеніі Васільеўны, 1933 г.н. (нар. у в. Буды), Асвея Верхнядзвінскага р-на.

[4] ФА ПДУ: Зап. у 2018 г. ад Скачыхіна Васіля Міхайлавіча, 1936 г.н., в. Мураўі Полацкага р-на.

[5] ФА ПДУ: Зап. у 2019 г. ад Лук'янавай Марыі Сцяпанаўны, 1936 г.н., в. Шпакоўшчына Полацкага р-на.

[6] ФА ПДУ: Зап. у 2020 г. ад Шокель Лілії Міхайлаўны, 1940 г.н., в. Дворнае Сяло Міёрскага р-на.

чалавеку не памерці з голаду. Прадукты збіральніцтва давалі неабходныя бялкі і вітаміны. Палявыя даследаванні амаль ва ўсіх раёнах Віцебшчыны фіксуюць, што самай распаўсюджанай раслінай, якую ўжывалі ў ежу быў палявы шчавель: "– (Дык, а што елі?) – *Шчавель!* – (А еще што дабаўлялі?) – *Не было болі чаго*" (Расонскі р-н)[7]; "*Шчаўлю пераела столькі, сколькі не нада, вот так*" (Полацкі р-н)[8]; *Хадзілі, сабіралі, іскалі і шчавель, і траву, і крапіву, і ўсе, дзе ж толькі было. Ужо і шчавель той абарвалі і няма, дзе той шчавель найді. Уся дярэўня ж… І травой гэтай і выжылі*"(Лепельскі р-н)[9]; "*Был очень страшный голод один сезон, пока новой картошки не дождались. Нас выручал щавель. Всех выручал. Мы ходили дети, мама с бабушкой – все на работе, а мы ходили с мешками под Дрису и под Двину, в Лешково… мы мешками таскали щавель, а мама варила и делала лепёшки. Из мешка получалось вот столько (показывает горсточку)*" (Верхнедвинский р-н)[10]. Шчаўе здаўна выкарыстоўвалася ў сістэме харчавання, аднак у паваенныя гады, па сведчаннях рэспандэнтаў, маштабы спажывання гэтай расліны значна ўзраслі і менавіта яна складала аснову сезоннага паўсядзённага рацыёну.

Разам са шчаўем часта ўзгадваецца крапіва, выкарыстанне якой у ежу было вельмі распаўсюджана ў веснавы перыяд: "*Ну крапіву варыць трэба было, шчаўлю нада было дабавіць, каб кіславата троху было і ўсё, і шчавель, крапіву і елі, не было нічога тады*" (Полацкі р-н)[11]; " – (А вот шчавель, крапіву ?) – *А ну эта кагда нарасцёт зелень, тогда ўже мы жылі. Тогда шчавель с крапівай – гэта ўжо харошыя, харошыя шчы шчыталісь. Вкусно, кісленькія*" (Глыбоцкі р-н)[12]; "*Лебяду, крапіву вясной, калі малоденькая*"(Міёрскі р-н)[13]. У галодныя гады крапіву выбіралі пад корань: "*Крапіву сабіралі, елі. Крапіўка малодзенькая, яна укусная. Калі я тут пайшла, гляджу – крапіва расцець, после вайны, кажу, ужо б абадралі, а цяпер зарастаець*"(Расонскі р-н)[14]. Успаміны рэспандэнтаў сведчаць пра тое, што крапіва ў якасці неабходнага кампанента паваеннай сістэмы харчавання ў веснавы перыяд была характэрна не толькі для вясковых жыхароў, але і гарадскога насельніцтва: "*Горад, тады мяшкамі сабіралі, спрашывалі: "Дзе які кустарнік, дзе лучшэ крапіва расцёт?" Сабіралі, дзетачка, гэтую крапіву.* – (З горада к вам крапіву сабіраць прыязжалі?) – *К нам! Мы самі пачці галадалі і к нам кажды дзень па дзесяць чалавек прыхадзіл: "Што-небудзь дайце". Каму бульбіну, каму дзве, каму лепёшку, каму бліночак, каму какой заціралкі даш паесці, людзі галодныя*"[15].

Крапіва з даўніх часоў шырока прымянялася ў штодзенным жыцці беларускага селяніна і выкарыстоўваецца да сённяшняга часу. Гэтая расліна ёсць даступнай, расце паблізу дамоў і агароджаў, уздоўж рэк, у хмызняках. Лісце крапівы з'яўляецца своеасаблівым прыродным полівітамінным канцэнтратам, бо ўтрымлівае аскарбінавую кіслату (да 200 мг%), вітаміны К, $B_2$, карацін і караціноіды (да 50 мг%), протапарфірын і хларафіл (да 5%), гліказід уртыцын, эфірны алей, дубільныя і бялковыя рэчы, мурашыную і пантатэнавую кіслоты, сітастэрын, віёлаксацін, камедзі, солі жалеза, кальцыю і калію, серу, воск [10, с. 219]. У перыяд адноснага дабрабыту ў ежу пераважна ўжывалі маладыя пабегі крапівы, успаміны пра экстрымальныя часы сведчаць, што на гэтую акалічнасць не звярталі ўвагі, аднак крэспандэнты ўсведамлялі ўздзеянне карысных уласцівасцей расліны. "Раньше делали салаты из крапивы. Послевоенное время – варили борщи, они очень полезные, много витаминов. Я показывал внучке, как есть сырую крапиву. Вот так скручиваешь листочки, съедаешь. Получается с одного-двух листочков – дневной рацион витаминов" [5, с. 160]. Неабходна адзначыць, што выкарыстанне крапівы не абмяжоўвалася сістэмай харчавання, яна мела і экстраўтылітарнае значэнне, якое з гледзішча вяскоўца было не менш важным для стабільнага жыццязабеспячэння.

Безумоўна, функцыянальнасць і эффектыўнасць збіральніцтва ў сістэме жыццезабеспячэння найперш былі абумоўлены канкрэтнымі прыроднымі ўмовамі мікрарэгіёну. Ад спецыфікі ландшафту залежаў спектр збіральніцтва і маштаб выкарыстання прыродных рэсурсаў. Напрыклад, аер, які часта сустракаецца ва ўспамінах пра пасляваенную рэчаіснасць, вельмі актыўна выкарыстоўваўся ў прыазёрных вёсках ці населеных пунктах паблізу рэк ці забалочаных участкаў. Пры гэтым можна адзначыць вельмі шырокую функцыянальнасць дадзенай расліны ў сістэме жыццезабеспячэння беларускай вёскі. Аер выкарыстоўвалі, як у якасці харчовага сурагату, так і ў якасці атрыбута, неабходнага для выпечкі хлеба, калі расліна дадавала гатоваму хлебнаму бохану асаблівы водар і прысмак: " – (А аер ці елі?) – *Елі, суп варылі… Сабіраеш, перабіраеш, сякеш, кіпятнком ашпарыш і тады, калі есць мука, прыкалоціш, а калі не, так*" (Расонскі р-н)[16];

[7]ФА ПДУ: Зап. у 2019 г. ад Таратуткі Любові Ягораўны, 1927 г.н, в. Галоўчыцы Расонскага р-на.

[8]ФА ПДУ: Зап. у 2019 г. ад Гураўчанка Валянціны Грыгор'еўны, 1928 г.н. у в. Махірова Полацкага р-на.

[9]ФА ПДУ: Зап. у 2019 г. ад Кавалёўскай Надзеі Александраўны, 1937 г.н., в. Мацюшына Лепельскага р-на.

[10] ФА ПДУ: Зап. у 2019 г. ад Скавародко Елены Усцінаўны, 1937 г.н., в Смулькава Верхнядзвінскага р-на.

[11] ФА ПДУ: Зап. у 2019 г. ад Гураўчанка Валянціны Грыгор'еўны, 1928 г.н. у в. Махірова Полацкага р-на.

[12] ФА ПДУ: Зап. у 2019 г. ад Мілеція Міхайлавіча Вяля, 1926 г.н., в. Ломашы Глыбоцкага р-на.

[13] ФА ПДУ: Зап. у 2020 г. ад Пашкоўскай Арыядны Уладзіміраўны, 1934 г.н., в. Целеўцы Міёрскага р-на.

[14] ФА ПДУ: Зап. у 2019 г. ад Высоцкай Таісіі Іванаўны, 1935 г.н, у в. Галоўчыцы Расонскага р-на.

[15] ФА ПДУ: Зап. у 2019 г. ад Якіменка Ліліі Якаўлеўны, 1931 г.н. (пад Віцебскам), г. Дзісна Міёрскага р-на.

[16] ФА ПДУ: Зап. у 2019 г. ад Высоцкай Таісіі Іванаўны, 1935 г.н, у в. Галоўчыцы Расонскага р-на.

"*Бывала, кагда хлеб пяклі раньшэ, аір гэты падсявалі, тады хлеб дужа ўкусна пахніць. Раньшэ ж пяклі хлеб усе. Ай, як укусна аір у хлебе!*" (Віцебскі р-н)[17]. У ежу спажывалі карэнні аеру, якія былі багатымі на крахмал, мелі вялікую колькасць эфірнага алею (да 4,8%), у склад якога ўваходзіць пінен (1%), камфен (7%), каламен (10%), d-камфара (8,7%) і інш., а таксама горкі глiказід акарын, дубільныя рэчывы, аскарбінавая кіслата (да 150 мг) [10, с. 124]. Дзякуючы фармакалагічным уласцівасцям расліну выкарыстоўвалі як лекавы сродак, які дапамагаў пры розных хваробах, пераважна праблемах са страўнікам ці зубамі: "*Ад жалудку памагаіць корань аіра, выкапаць яго, памыць добра і пасушыць*"(Докшыцкі р-н)[18]; "*Мне балеў неяк зуб, работала на ферме, а мне гаворань, ёсць аірава карэнне. У стакан кіпятку, аірава карэнне – і пастаіць сколькі, нацяніць. Тры-чатыры карашкі. Я ж гэта здзелала, а вада – горкая-горкая. Вазьмі у рот вады. Ды пайшла я да фермы. Пахадзіла па ферме і горка стала ў роце, запякло кожу, мне зуб ужо і не балеў, пайшла да ўрача. Дык я яго умярцвіла, той зуб гэтым карэннем аіра*"(Докшыцкі р-н)[19]. Ва ўспамінах пра першыя пасляваенныя гады аер часта фігурыраваў як надзейны сродак ў барацьбе з блохамі: "*Ну, а тады пасля, ужо не знаю чым, і вошы гэтыя пайшлі, а блохі засталіся. А блохі аіру баяліся. Нехта ж падсказываў. Мама калі пойдзець куды-небудь, там на сабранне, а мы з братам бягом у стаўкі, аіру гэтага налупім і абкладаліся….*" (Верхнядзвінскі р-н)[20]; "*Аір рвалі, кідалі па зямлі, даўней жа было клапоў, не клапоў, а блох, ад блох кідалі*" (Ушацкі р-н)[21]. Аер выкарыстоўвалі ў штодзенным жыцці. Адвар з карэнняў ўжывалі для ўмацавання валасоў: "*у ваду гарачую аір кідалі. Ён вабшчэ, і галаву, воласы дужа добра. Корнямі.*" (Докшыцкі р-н)[22]. З расліны рабілі для дзетак лялькі: "*З аіра дзелалі лялькі, косы заплятали. Рабяты як лучшых не відзелі, так і гэты былі ігрушкі. Усё сваё было, грошай не было*" (Верхнядзвінскі р-н)[23]. Прысутнічаў аер і ў абрадавым жыцці паваеннай беларускай вёскі – ім традыцыйна ўпрыгожвалі хаты на Троіцу.

Матэрыялы вуснай гісторыі пра пасляваенны час фіксуюць, што рэестр раслін, якія выкарыстоўваліся ў якасці харчовага дадатку значна павялічваецца за кошт тых зёлак і раслін, ці іх частак, якія ва ўмовах адноснага дабрабыту практычна не выкарыстоўваліся (кара дрэў, канюшына, шчавульнік, асака, лебяда, хвошч, шнітка, кісліца і інш.). Гэта падцвярджаецца дакументамі, якія захоўваюцца ў архівах. Напрыклад, журналіст цэнтральнай савецкай газеты "Праўда" паведамляў галоўнаму рэдактару сваё ўражанне ад прыезду ў Беларусь вясной 1946 г.: "Я посетил также восточные районы БССР, в Освейском районе в колхозе "Красные стрелки" люди едят лебеду, березовую и сосновую кору, и это 2 года после освобождения!" [11, с. 102]. Шырокае бытаванне экстрэмальнай гастранаміі фіксуецца пераважна ва ўсходніх, найбольш пацярпелых ад вайны, раёнах рэгіёну. "*Вярнуліся на папялішча. Пустая дзярэўня. Сабіралі ўсякую траву, пучкі, асобена вясной. Яны з вясны асобенна растуць такія **гегялькі**. І мы іх сабіралі і елі прама там, як і шчавель, сырым*" (Верхнядзвінскі р-н)[24]; "*Ай траву, траву всякую елі.* – (А якую?) – *Ну **гягелі** елі.* – (А это што за трава?) – *Яны такія як струкі. Рвалі, малолі, мялі, пышкі пяклі*" (Расонскі р-н)[25];. "*Во, трава асака – скублі. А так, **клевер** сядзіць белы, а то красны, сушылі яго*" (Докшыцкі р-н)[26]; "*Елі траву. Во якая расцець **дыдка** такая і семя чорнае, **шчавульнік***"(Полацкі р-н)[27]. Неабходна адзначыць, што спажыванне шчавульніка (ці конскага шчаўля) ў пасляваеннай сістэме жыццезабеспячэння не абмяжоўвалася харчовай сферай, корань расліны выкарыстоўваўся ў якасці лекавага сродку: " (Так, а конскі шчавель, там што бралі вот эты зерні? ) – *Корань. І гэтат корань цёрлі, тады ў кіпяток гэтат, конскі, гэтат шчавель, і гэтым мыемся. І вот раз памыемся ў бане, два, тры і гэта ўжэ, часотка гэта прападае*" (Полацкі р-н)[28]. Палявыя матэрыялы фіксуюць, што і ў заходніх раёнах уключэнне ў паўсядзённы пасляваенны рацыён раслінных прадуктаў-сурагатаў было таксама значна пашырана."*Шчавульнік, а там зёрнушкі, сморгалі, сушылі, перамалвалі*"(Глыбоцкі р-н)[29]; "*Тады такая асочка была, яна неяк як гарошак, дробненькая, збіралі гэтую асочку, малолі і елі..*" (Міёрскі р-н)[30].

Акрамя травы, якую спажывалі з вясны, распаўсюджаным харчовым рэсурсам былі разнастайныя ягады. "*Як тока начынаюцца вот эта, мы тока гэтым і жылі. Лесам. Гэта ўжо былі вот так наеўшысь*"

---

[17] ФА ПДУ: Зап. у 2007 г. ад Ганчаровай Аляксандры Ігнатаўны, 1925 г.н., в. Аляксандраўка Віцебскага р-на.

[18] ФА ПДУ:Зап. у 2011 г. ад Гапаненак Ганны Васільеўны, 1933 г.н. у в. Валодзькі Докшыцкага р-на.

[19] ФА ПДУ: Зап. у 2011 г. ад Кіцько Ганны Сямёнаўны 1925 г.н. у в. Сабары Докшыцкага р-на.

[20]ФА ПДУ: Зап. у 2018 г. ад Гайбут Веры Кірылаўны, 1941 г.н., в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.

[21]ФА ПДУ: Зап. у 2006 г. ад Кулічонак Анны Антонаўны, 1928 г.н., в. Старына Ушацкага р-на.

[22]ФА ПДУ: Зап. у 2009 г. ад Карніловіч Аляксандры Рыгораўны, 1936 г.н., в. Стараселле Докшыцкага р-на.

[23]ФА ПДУ: Зап. студ. ПДУ Захарэвіч Ала і Жолудзева Паліна ад Мядзель Марыі Васілеўны, 1927 г.н., нар. у в. Аляксееўцы і Казловай Ніны Іванаўны, 1941 г.н., нар. у в. Страшныя (Новы Строй) у в. Дзёрнавічы.

[24]ФА ПДУ: Зап. у 2020 г. ад Аненскай Яўгеніі Васільеўны, 1933 г.н. (нар. ў в. Буды), Асвея Верхнядзвінскага р-на.

[25]ФА ПДУ: Зап. у 2019 г. ад Шаўцовай Валянціны Іванаўны, 1929 г.н., в. Янкавічы Расонскага р-на.

[26]ФА ПДУ: Зап. у 2009 г. ад Пецько Галіны Сцяпанаўны, 1931 г.н., в. Рачныя Докшыцкага р-на.

[27]ФА ПДУ: Зап. у 2020 г. ад Чарневіч Зінаіды Матвееўны, 1939 г., в . Заазерье Полацкага р-на.

[28]ФА ПДУ : Зап. у 2019 г. ад Гураўчанка Валянціны Грыгор'еўны, 1928 г.н. у в. Махірова Полацкага р-на.

[29]ФА ПДУ : Зап. у 2020 г. ад Куц Аллы Янаўны, 1936 г.н. (нар. у в. Хралы Глыбоцкага р-на).

[30]ФА ПДУ: Зап. у 2020 г. ад Пашкоўскай Арыядны Уладзіміраўны, 1934 г.н., в. Целеўцы Міёрскага р-на.

(Полацкі р-н)[31]. Збіралі чарніцы, суніцы, маліны, брусніцы, журавіны. Большасць рэспандэнтаў адзначала, што ў паваенныя гады вельмі шмат было маліны: "*Маліну вось пасля вайны, можа што было пажжонае ўсё і пустувала, но маліны было проста наросшы мора.*"(Верхнядзвінскі р-н)[32]. Ягады выкарыстоўвалі ў ежу, асабліва чарніцы, якія паспявалі ў палове чэрвеня і іншы раз гэта быў асноўны прадукт харчавання: "*Як была дзеўкай як няма што есці дык тады, карова была, малака, ягада чарніка, наберыш і паясі, а тады ў малако насыпеш і лыжкай гэтыя ягады чарнікі і з малаком*" (Браслаўскі р-н)[33]. Ягады, якія патрабавалі цукру для кансервацыі, на зіму не нарыхтоўваліся, адразу спажываліся. "*Некалі было хадзіць. Калі толькі для сябе, да і то ж сахара не было. За невашта было купіць. Мы малыя бегалі, поўную даяначку наберым, прынясём і з малаком з'ядзем*"(Полацкі р-н)[34].

Ва ўспамінах пра паваенны час большасць рэспандэнтаў, пераважна з населеных пунктаў, якія былі ў адноснай даступнасці ад горада, ці буйных мястэчак, чыгуначных станцый, узгадвалі пра камерцыйны аспект збіральніцтва. Бо рэалізацыя ягад прыносіла невялікі, але стабільны даход, які даваў неабходныя сродкі для набыцця базавых прадуктаў харчавання і тавараў першай неабходнасці: "*Ягадзіну, бегалі, сабіралі – прадавалі. У Бешанковічы пяшком насілі*" (Бешанков р-н)[35]; "*Саберыш ягад якіх-небудзь і нясёш на плячах, вот так напрамкі, цераз лес. Тады прададзім на базары, купім хлеб і камсы якой-небудзь. Хадзілі і дарослыя, нада ж была і капеечка, нада ж было хлеб купіць. Раненька да работы пабягуць і саберуць, а потым у горад вырвуцца. А як жыць?!*" (Полацкі р-н)[36]. Прыведзены прыклад, хутчэй выключэнне, бо большасць рэспандэнтаў сведчаць, што збор і рэалізацыя ягад у паваенныя гады з большага ўваходзіла ў кампетэнцыю дзяцей, бо дарослыя былі занятыя ці ў калгасе, ці ў сваёй гаспадарцы. "*Мне было помню адзінаццаць гадоў, як мы ў дзяцінстве ягады: чарніцы, маліны сабіралі і насілі прадаваць у тое Варапаева на базар. Дзень збіраем, а на другі дзень нясём прадаваць за капейкі. А пад вечар наша мама ішла сюды ў Варапаева за гэтыя нашы капейкі ў вочарадь за хлебам*" (Пастаўскі р-н)[37]; "*Маці ў мяне была толькі адна і ёй хватала хазяйства, ужо я як падрасла, то я ужо хадзіла ў ягады*" (Глубоцкі р-н)[38].

Калі сталі дзейнічаць нарыхтоўчыя канторы, то ягады і грыбы пачалі здаваць туды, каб атрымаць дадатковыя грошы ці тавары. Гэта, у сваю чаргу, актуалізавала збіральніцтва і павысіла яго значэнне ў гаспадарчай дзейнасці вяскоўцаў, перш за ўсё для тых населенных пунктаў, якія з-за свайго месцараспалажэння не маглі атрымоўваць дадатковы прыбытак ад рэалізацыі, напрыклад, тых жа ягад. Неабходна адзначыць, што рэспандэнты, якія пражывалі на тэрыторыі заходніх раёнаў, узгадвалі, што актыўнае збіральніцтва пачалося пасля таго, як былі арганізаваны нарыхтоўчыя пункты: "*Гэта ўжо после сталі іх прынімаць. Ну капейку можа якую мне… я ж ужо помню хадзіла мне можа гадоў было дзесяць.*(А колькі сабралі?) *Ну, сабіралі скольні каму хто сколька можаць. Вядро хто насабіраець, ну. А як не было дык і эта ж капейка, ну. Тыя я ж капейкі, ну куды ў хату ж дамоў, куды прынасілі і нада ж было нешта купіць, надаж было нешта і надзець, надаж было нешта і абуць*" (Глыбоцкі р-н)[39]. "*І клюкву, і брусніку сабіралі, і земляніку сабіралі, і черніку сабіралі, і маліну сабіралі.* (А што вы з ёй рабілі? Самі елі ці кудысці здавалі, прадавалі?) – *Здавалі ў гасударства, прынімалі ўсе ягады, загатавіцелі былі так называемыя. Загатавіцелі прынімалі, ну і капейкі нейкія плацілі. Мы ўсё маме з татам атдавалі, дзеньгі*" (Міёрскі р-н)[40].

Значны прыбытак прыносіла збіральніцтва журавін, якое было камерцыйна прыбытковым у тых раёнах, якія знаходзіліся каля балот. "*У ягады ня толька мае, тут уся вёска хадзіла. Выйдзець цэлае стада – іх атрад па дзесяць, па дванаццаць чалавек, і болей. Збіралі, скольні панясець. Журавіны. А тады і пад'ежджаем, бываець, калі, то на кані, то на ровэры, то як-небудзь падойдзеш, дзе ўжо, як выцягнуць яны з Моху. Вучылісі, на канікулы прыедуць – на Мох, ягады збіралі, прадавалі, нада ж была сабе грошы напакаваць на зіму*" (Шаркаўшчынскі р-н) [12, с. 332–333]; "*У нас клюква там болей, як ужо даход быў, болей з клюквы*" (Міёрскі р-н)[41]; "*Клюкву восенню, вёдрамі сабіралі і насілі, балоты бальшые, клюквы было многа*"(Полацкі р-н)[42]. Журавіны нарыхтоўвалі восенню і вясной – перазімаваная на імху ягада была лепшай, бо мела больш клёку [1, с. 42].

---

[31]ФА ПДУ: Зап. у 2018 г. ад Рудзёнка Фёдара Антонавіча, 1937 г. н., Рудзёнак (Лаўчыноўская) Леаноры Леанідаўны, 1944 г.н., в. Загацце Полацкага р-на.

[32]ФА ПДУ: Зап. у 2020 г. ад Аненскай Яўгеніі Васільеўны, 1933 г.н. (нар. ў в. Буды), Асвея Верхнядзвінскага р-на.

[33]ФА ПДУ: Зап. у 2018 г. ад Ядзялы Станіславы Адольфаўны, 1927 г.н. у в. Ёдлавічы Браслаўскага р-на.

[34]ФА ПДУ: Зап. у 2018 г. ад Маісеенка Марыі Філіпаўны, 1931 г.н. у в. Мураўшчына Полацкага р-на.

[35]ФА ПДУ: Зап. у 2014 г. ад Раўковай Галіны Сідараўны, 1927 г.н., у в. Соржыца Бешанковіцкага р-на.

[36]ФА ПДУ: Зап. у 2020 г. ад Чарневіч Зінаіды Матвееўны, 1939 г.н., у в . Заазерье Полацкага р-на.

[37]ФА ПДУ: Зап. у 2014 г. ад Буката (Іваноўскай) Яніны Іванаўны 1943 г.н., у в. Луцк-Казлоўск (хутар Козеўка), Пастаўскага р-на.

[38] ФА ПДУ: Зап у 2018 г. ад Апанасёнак Клеапатры Міхайлаўны, 1940 г.н., в. Галубічы Глыбоцкага р-на.

[39]ФА ПДУ: Зап. у 2018 г. ад Гіль Феафаніі Іосіфаўны, 1940 г.н. у в. Калечполле Глыбоцкага р-на.

[40]ФА ПДУ: Зап. у 2019 г. ад Гіргель Франі Юзэфаўны, 1944 г.н., (нар. у в. Фядосава Міёрскага р-на), у г. Дзісна.

[41]ФА ПДУ: Зап. у 2019 г. ад Сташкевіч Вольгі Аляксееўны, 1935 г.н., у г. Дзісна Міёрскага р-на.

[42]ФА ПДУ: Зап. у 2019 г. ад Гураўчанка Валянціны Грыгор'еўны, 1928 г.н., у в. Махірова Полацкага р-на.

Рэалізацыя ягад была адной з магчымых крыніц дзіцячага заробку, які яны выкарыстоўвалі, каб набыць неабходныя рэчы, напрыклад, для школы, ці нейкі ласунак: "*Мы ў клюкву хадзілі. Ягады прадавалі, здавалі. Наберыш клюквы, здасі і купялі тетрадкі, кніжкі, ручкі. Самі сабе.*" (Міёрскі р-н)[43]. Аднак у першыя паваенныя гады (асабліва актуальным гэта было для ўсходніх раёнаў) грошы ад продажу ягад ішлі для набыцця базавых прадуктаў харчавання. "*Я помню мы сабіралі клюкву, а тады ў Баравуху пяшком насілі, стаканам прадавалі. Вясной, з-пад зімы (яна астаеццца харошая клюква). Пакупалі людзі, там жа ваенныя афіцэравы жоны былі, куплялі. І вось клюкву прададзім, купім 2-3 скібкі хлеба і дамоў прыйдзем.*" (Расонскі р-н) [44].

У адроўненні ад ягад, грыбы, узгадваюцца ва ўспамінах менш. Большасць рэспандэнтаў адзначала, што збіралі і нарыхтоўвалі (пераважна сушылі) для сябе, а не на продаж. "*Грыбы сабе сабіралі. Не насілі. Цяпер усялякія збіраюць. Мы такіх даўней не зналі. Лісічкі, баравічкі, такія харошанькія. Мачонак намочым*" (Полацкі р-н)[45]. Збіралі хто ў што меў: у збанкі, гаршкі, каробкі, кошыкі.

Збіральніцтва давала не толькі неабходныя харчовыя рэсурсы, але і рознага рода сыравіну для аднаўлення ўласнай гаспадаркі. Напрыклад, у паваенныя гады, калі мелася патрэба ў аднаўленні жылога фонда і гаспадарчых пабудоў, вельмі актыўна збіралі балотны мох, які выкарыстоўваўся для імшэння хаты. Нарыхтоўвалі лазу, якая ішла на розныя гаспадарчыя прылады і абутак. Акрамя гэта лаза была запатрабавана ў нарыхтоўчых канторах. "*Помню, яшчэ не толькі ягады прынімалі, мы хадзілі дралі лазу такую, а патом у пучкі сушылі і сушоную лазу прынімалі тожа загатавіцелі*" (Міёрскі р-н)[46]; "*Дралі лазу, дралі лазу, сушылі пучкамі пад хатай, а тада, када многа скаплялася гэтай лазы, папа браў каня, калёсы і вазілі ў Камене здаваць, за адін кілаграм лазы плацілі ў то время двацацаць капеек*" (Лепельскі р-н)[47]. Аднак вывучэнне сыравінных аспектаў збіральніцтва ў паваенны час, як і ролі іншых традыцыйных промыслаў у сістэме жыццезабеспячэння беларускай вёскі ўяўляе сабой прадмет асобнага навуковага даследавання.

**Заключэнне.** Збіральніцтва ў першыя гады пасля вызвалення адыгрывала каласальную ролю ў сістэме жыццезабеспячэння беларускай вёскі. Дзікарослыя расліны, ва ўмовах недахопу базавых прадуктаў, з'яўляліся адным з неабходных для жыццядзейнасці арганізма рэсурсам. Асабліва актуальным яно было для жыхароў усходніх раёнаў Беларусі, якія былі найбольш спустошаны пасля вайны, а неспрыяльныя ўмовы надвор'я ў 1945 і 1946 гг. яшчэ больш ускладнялі сітуацыю з харчаваннем. Збіральніцтва давала неабходны мінімум, які дазваляў чалавеку не памерці з голаду і пратрымацца да новага ўраджаю. Разам з гэтым, матэрыялы вуснай гісторыі фіксуюць, што і ў заходніх раёнах краіны ўключэнне ў паўсядзённы пасляваенны рацыён дзікарослых раслін і раслінных прадуктаў-сурагатаў было таксама значна пашырана.

Прыклад Віцебшчыны паказвае, што збіральніцтва было традыцыйным заняткам вяскоўцаў (грыбы і ягады – каштоўны харчовы рэсурс, які немагчыма было здабыць на ўласных палетках), але ў экстрымальны перыяд рэестр раслін, якія выкарыстоўваліся ў якасці харчовага дадатку, значна павялічваецца за кошт тых зёлак, ці іх частак, якія ва ўмовах адноснага дабрабыту практычна не выкарыстоўваліся (шчавульнік, хвошч, асака і інш). Пасля таго, як знікла праблема галоднай смерці, збіральніцтва захоўвала актуальнасць, але вярталася да сваей класічнай формы, калі прадметам промысла выступалі грыбы, ягады, некаторыя расліны (шчавель, крапіва і інш.).

Функцыянальнасць (абрадавая, лекавая, гастранамічная, пабытовая) і эффектыўнасць збіральніцтва ў сістэме пасляваеннага жыццезабеспячэння найперш былі абумоўлены канкрэтнымі прыроднымі ўмовамі і месцараспалажэннем мікрарэгіёну. Спажыванне, продаж ці нарыхтоўка "дароў прыроды" залежала ад іх уласцівасцей і магчымасцей для захоўвання. Успаміны сведчаць пра тое, што ў першае пасяляваеннае дзесяцігоддзе актуалізуюцца этнабатанічныя веды пра расліны, іх харчовыя і лекавыя ўласцівасці.

Збіральніцтва давала не толькі неабходныя для выжывання харчовыя рэсурсы, але і сыравіну, патрэбную для аднаўлення ўласнай гаспадаркі. У першыя пасляваенныя гады прадукты збіральніцтва з'яўляліся крыніцай дадатковых паступленняў у бюджэт сялянскай сям'і (продаж на рынку ці здача ў нарыхтоўчыя канторы). Збор і рэалізацыя ягад была адной з магчымых крыніц дзіцячага заробку, даходы ад якой пакрывалі выдаткі, напрыклад, на адукацыю.

## ЛІТАРАТУРА

1. Беларусы : у 8 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995 – 2005. – Т.1 : Прамысловыя і рамесныя заняткі / рэдкал.: В.К. Бандарчык [і інш.]. – 1995. – 351 с.
2. Цітоў, В.С. Народная спадчына: Матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці / В.С. Цітоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 300 с.

[43] ФА ПДУ: Зап. у 2020 г. ад Шокель Ліліі Міхайлаўны, 1940 г.н., в. Дворнае Сяло Міёрскага р-на.

[44] ФА ПДУ: Зап. у 2019 г. ад Высоцкай Таісіі Іванаўны, 1935 г.н, у в. Галоўчыцы Расонскага р-на.

[45] ФА ПДУ: Зап. у 2020 г. ад Чарневіч Зінаіды Матвееўны, 1939 г.н., в . Заазерье Полацкага р-на.

[46] ФА ПДУ: Зап. у 2019 г. ад Гіргель Франі Юзэфаўны, 1944 г.н., (нар. у в. Фядосава Міёрскага р-на), у г. Дзісна.

[47] ФА ПДУ: Зап. у 2018 г. ад Наркеўскай Сафіі Максімаўны, 1949 г.н., в. Бароўка Лепельскага р-на.

3. Новогродский, Т.А. Хлеб в традиционной культуре белорусов в XIX – нач.XX в. / Т.А. Новогродский // Хлеб в народной культуре: Этнографические очерки. – М. : Наука, 2004. – С. 173 – 177.
4. Навагродскі, Т.А. Эвалюцыя традыцый харчавання беларусаў у XIX – XX стагоддзях / Т.А. Навагродскі. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2015. – 243 с.
5. Кнурэва. Я.С. Дзікарослы раслінны свет у традыцыйных уяўленнях і сучасным жыцці беларусаў / Я.С. Кнурэва. – Мінск : Беларуская навука, 2019. – 207 с.
6. Шумскі, К.А. Традыцыйныя веды беларусаў аб раслінным, жывёльным свеце і надвор'і (XIX – пачатак XXI ст.) і іх экалагічная значнасць / К.А. Шумскі. – Мінск : Права і эканоміка, 2009. – 126 с.
7. Занальны дзяржаўны архіў горада Полацка (далее – ЗДА г. Полоцка). – Ф. 1093. Воп. 1. Спр. 9.
8. ЗДА г. Полоцка. – Ф. 143. Воп. 2. Спр. 25.
9. Ossendowski, F. Antoni. Polesie / F. Antoni Ossendowski. – Poznań : Wydawnictwo Polskie, 1934. – 209 s.
10. Шмярко, Я.П. Лекавыя расліны ў комплексным лячэнні / Я.П. Шмярко, І.П. Мазан. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 399 с.
11. Шумскі, Я. Саветызацыя Заходняй Беларусі (1944 – 1953 гг.) / Я. Шумскі. – Беласток : Беларус. гіст. тав-ва, 2012. – 362 с.
12. Полацкі этнаграфічны зборнік. – Вып. 2. Народная проза беларусаў Падзвіння : у 2 ч. / уклад., прадм. і паказ. У.А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 2. – 368 с.

*Паступіў 09.12.2020*

## GATHERING IN THE LIFE SUPPORT SYSTEM OF THE POST-WAR BELARUSIAN VILLAGE

***A. SUMKO***

*The article analyzes the role and place of gathering in the life support system of the post-war Belarusian village under the restoration processes. The sources were oral history materials. For the first time, the ethnographic sources recorded during the field research in the 2000s on the territory of the Belarusian Podvinye were introduced into scientific discourse.*

***Keywords:*** *post-war reconstruction, village, life support system, crafts, gathering, Belarusian Podvinye.*